Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Каб атрымаць добры вынік, вам неабходна праяўляць ініцыятыву, уносіць новыя прапановы, не псуючы пры гэтым стасункі з начальствам. У аўторак будзе складана захоўваць паразуменне з калегамі. Паспрабуйце не ўпадаць у крайнасці. Гардыня не застаецца без пакарання, так што думкі пра тое, што вас недастаткова цэняць, лепш гнаць адразу. У выхадныя дазвольце сабе маленькія слабасці.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні нават паражэнне можа абярнуцца перамогай. Будзе шмат асабістых амбіцый і жаданне пусціць пыл у вочы, але замест гэтага давядзецца шмат працаваць, каб даказаць сваю кампетэнтнасць. Праўда, у панядзелак лянота пагражае заглушыць усе іншыя імкненні, але ў другой палове тыдня сіл і энергіі значна дадасца. А вось у выхадныя, хутчэй за ўсё, прыйдзецца разбірацца з назапашанымі хатнімі справамі і сямейнымі праблемамі.

БЛІЗНЯТЫ. Паспрабуйце хоць бы на гэтым тыдні разгрузіць сябе ад лішніх і чужых спраў. Не апускайце рукі, у вас усё атрымаецца. У сераду варта кінуць сілы на рашэнне старых праблем, а каб не губляць упэўненасці, пабольш майце зносіны з блізкімі людзьмі. У выхадныя дні вас чакае рамантычнае спатканне.

РАК. У найбліжэйшыя дні можаце паспяхова справіцца з самымі складанымі задачамі, якія раней падаваліся невырашальнымі. У сераду пажадана знізіць аб'ём работы, ёсць рызыка не справіцца, паспрабуйце аб'ектыўна ацэньваць свае магчымасці. Не расказвайце пра сябе занадта многа. Але і не хавайце сваіх пачуццяў ад сяброў. Асноўную работу лепш паспець завяршыць да суботы. У сям'і варта паводзіць сябе далікатна і стрымана.

ЛЕЎ. Рызыкуеце апынуцца ў цэнтры падзей, на вашай сціплай персоне будзе засяроджана ўвага навакольных. І гэта вас саб'е з панталыку. У сераду вашы прафесіяналізм і выдатныя арганізатарскія здольнасці будуць ацэнены належным чынам. У выхадныя можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Удзяляйце больш увагі бацькам, ім гэта неабходна.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні вы зможаце аказаць уплыў на людзей і дамагчыся свайго. Аднак дзейнічаць трэба не сілай і напорам, а тонка і далікатна. Самі пазбягайце рабіць тое, чаго вам катэгарычна не хочацца. У чацвер і пятніцу не варта залішне перажываць з-за падзей, якія адбываюцца, усё складзецца найлепшым чынам. У суботу настройцеся на лепшае, гэты дзень абяцае быць вельмі ўдалым.

ШАЛІ. Небяспечна разлічваць толькі на розум. Пакуль вы будзеце абдумваць кожную найдрабнейшую дэталь, натхненне ўцячэ і ўся канструкцыя разваліцца. У аўторак вас чакаюць цікавыя сустрэчы і зносіны з важнымі людзьмі. Лёс абавязкова чымнебудзь вас адорыць і ў гэтай сітуацыі, галоўная задача — адрозніць падарунак лёсу ад звычайнай выпадковасці. Дзелавыя перагаворы з партнёрамі акажуцца паспяховымі.

СКАРПІЁН. Поспехі і дасягненні — гэта ўжо вельмі пахвальна, але вы можаце дамагчыся большага, атрымаць прэмію і павышэнне па службе. Вашы амбіцыі ў прафесійнай сферы будуць задаволеныя. Не забывайце пра сваякоў і сяброў, зараз нядрэнны час для прымірэння і аднаўлення адносін. У пятніцу ёсць магчымасць з'яўлення ўплывовага заступніка.

СТРАЛЕЦ. Панядзелак і аўторак — выдатныя дні для новых планаў і задум і для пачатку іх рэалізацыі. У сераду непажадана пагаршаць канфліктную сітуацыю, будзьце асцярожныя ў меркаваннях, бо можа паступіць скажоная інфармацыя. Адкладзіце ў пятніцу ўсе сур'ёзныя справы і займайцеся толькі тымі, якія можна хутка завяршыць. У выхадныя дні больш уважліва пастаўцеся да свайго самаадчування.

КАЗЯРОГ. Вашы дзеянні могуць выклікаць у навакольных неадназначныя ацэнкі. Пастаўцеся да гэтага спакойна і абыякава. Сваёй упэўненасцю вы толькі павялічыце павагу да сябе і ўмацуеце аўтарытэт. Гніце сваю лінію і пераадольвайце перашкоды. Важна накіраваць сілы на самую важную мэту, а не растрачваць іх па дробязях. Ёсць імавернасць узнікнення праблем у сям'і, гэта сітуацыя падвядзе вас да некаторых змен, магчыма, давядзецца перагледзець адносіны, якія склаліся.

ВАДАЛІЎ. У першыя тры дні тыдня імаверны рэзкія перапады настрою, хоць асаблівых прычын для гэтага не прадбачыцца. У аўторак проста неабходна завяршаць усе пачатыя справы, што засталіся недароблены, яны могуць павіснуць мёртвым грузам надоўга. У пятніцу добра было б адправіцца ў адпачынак. Вам пашанцуе са спадарожнікамі. Паспрабуйце больш часу праводзіць з блізкімі людзьмі.

РЫБЫ. Добра было б даведацца нешта новае, схадзіць на лекцыю або майстар-клас. Выяўляйце мудрасць і абачлівасць у сваіх рашэннях, бо ад гэтага будзе залежаць найбліжэйшая будучыня. Вас можа чакаць выпрабаванне на трываласць у асабістых адносінах. Калі вы схільныя да рызыкі, то цяпер лепш пазбягаць такіх сітуацый. У сераду ўсё задуманае здзейсніцца дзякуючы дапамозе сяброў і блізкіх. У чацвер адбудуцца цікавыя падзеі, якія могуць адкрыць перад вамі новыя перспектывы і гарызонты.

Даты Падзеі Людзі

13 ЛІПЕНЯ

У краіне

1260 год — войска Вялікага Княства Літоўскага разграміла крыжакоў каля возера Дурбэ (Усходняя Латвія). Паражэнне ордэна паслужыла штуршком для шматлікіх паўстанняў заваяваных прыбалтыйскіх народаў, у першую чаргу — прусаў, таксама куршаў, земгалаў і сарэмскіх эстонцаў. Акрамя таго, прыбалтыйскія народы ўсвядомілі неабходнасць аб'яднання з князямі ВКЛ для супрацьстаяння германскім рыцарам. Згодна з летапісамі, бітва адбылася пасля паходу войска вялікага князя Міндоўга на Прусію. Не выключана, што літоўскім войскам у бітве пры Дурбэ камандаваў менавіта сам Міндоўг. Згодна з лівонскай Рыфмаванай хронікай і хронікай Пятра Дуйсбургскага, загінула 150 рыцараў ордэна, шмат простых ваяроў, магістр Бурхард фон Хорнхаўзен, маршал Генрых Ботэль, шведскі прынц Карл, якія ўзначальвалі паход крыжакоў. У палон трапіла каля 15 рыцараў. Адразу ж пасля заканчэння бітвы літоўскае войска адступіла разам з ваеннымі трафеямі ў Літву, не стаўшы працягваць ваенную кампанію ў Курляндыі.

1858 год — нарадзіўся (Мінская губерня) Андрэй Іпалітавіч Вількіцкі, гідрограф-геадэзіст, генерал-лейтэнант. У 1880 годзе скончыў Марскую акадэмію ў Пецярбургу. У 1887-м узначаліў экспедыцыю на Новую Зямлю, дзе вёў гравітацыйныя назіранні. У 1894—1901 гадах пад яго кіраўніцтвам праводзіліся гідраграфічныя даследаванні ад вусця Пячоры да ракі Енісей, у Енісейскім заліве і Обскай губе. У 1907—1913 гадах узначальваў Галоўнае гідраграфічнае ўпраўленне. Аўтар навуковых прац па гідраграфіі і геадэзіі. Памёр у 1913 годзе.

У свеце

1948 год — нарадзіўся (г. Барысаў) Леанід Пятровіч Козік, беларускі дзяржаўны дзеяч, доктар эканамічных навук, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. У 1985—1990 гадах — дырэктар Барысаўскай швейнай фабрыкі, у 1995—1998-м — член Калегіі, паўнамоцны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь у Міждзяржаўным эканамічным камітэце Эканамічнага саюза СНД, з 1998-га — намеснік прэм'ер-міністра, з 2001-га — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з 2002 года — старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Аўтар прац па пытаннях эканомікі і права.

1878 год — краінамі-ўдзельніцамі Берлінскага кангрэса падпісаны Берлінскі трактат, у адпаведнасці з якім былі перагледжаны ўмовы Сан-Стэфанскага міру 1878 года і ажыццёўлены новы перадзел Балкан. Была пацверджана незалежнасць Чарнагорыі, Сербіі і Румыніі. Паўночная Балгарыя стала незалежнай дзяржавай, Паўднёвая Балгарыя (Усходняя Румелія) засталася пад уладай турэцкага султана, атрымаўшы адміністрацыйную аўтаномію. Да Расіі адышлі вусце Дуная, крэпасці Карс, Ардаган і Батум. Аўстра-Венгрыя акупавала Боснію і Герцагавіну.

1923 год — нарадзіўся Міхаіл Іванавіч Пугаўкін, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Дзяўчаты», «Вяселле ў Малінаўцы», «Дванаццаць крэслаў» і многіх іншых. Памёр у 2008 годзе.

1928 год — нарадзіўся Валянцін Пікуль, савецкі пісьменнік. Аўтар 30 гістарычных раманаў і аповесцяў, у тым ліку «Пяром і шпагай», «Фаварыт», «Гонар маю» і інш. Лаўрэат шматлікіх прэстыжных прэмій у галіне літаратуры. Памёр у 1990 годзе.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.54	21.36	16.42
Віцебск —	4.36	21.33	16.57
Магілёў —	4.44	21.26	16.42
Гомель —	4.49	21.14	16.25
Гродна —	5.11	21.49	16.38
Брэст —	5.20	21.42	16.22

Месяц

Маладзік у 5.48.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Варфаламея, Івана, Мацвея, Піліпа, Пятра, Сафрона, Сімона, Якава.*
К. *Маргарыты, Сары, Андрэя.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Я больш не магу вытрымліваць гэтую дыету, учора ледзь не адкусіла вуха мужу.

— Вуха — гэта нічога. Падумаеш, усяго нейкія 80 калорый...

Калі на дачы смажыш шашлыкі, то кожны, хто падыходзіць, лічыць сваім абавязкам памяшаць вуглі або павярнуць шампуры, хоць ты гэта толькі што рабіў. Але вось калі капаеш зямлю, ніхто з тых, што падышоў, не возьме рыдлёўку і не працягне табою распачатую справу...

Мужык, які згубіў учора барсетку. Ведай: сем тостаў было за цябе!

Пайду пасплю. Так ад мяне шкоды менш...



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2561.

Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12